КОРМАВЫТВОРЧАСЦЬ

УДК 633.853

В. М. ШЛАПУНОЎ

АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ПА КОРМАВЫТВОРЧАСЦІ, ВЫКАНАНЫХ У 1986—1990 гг.

Палявая кормавытворчасць. У групе кармавых культур на ворыве асноўную плошчу (58,5%) у рэспубліцы займаюць шматгадовыя травы. У Інстытуце земляробства ў мінулай пяцігодцы праводзіліся даследаванні па іх селекцыі і ўдасканальванню тэхналогіі вырошчвання. У выніку селекцыйнай работы створаны і перададзены ў дзяржсортавыпрабаванне тры сарты канюшыны: Віцяблянін, Шматгадовая, Атаўная.

Асноўнай вартасцю дыплоіднага сорту канюшыны лугавой Віцяблянін у параўнанні са стандартам Мінская познаспелая з'яўляецца тое, што, маючы прыкладна аднолькавую кармавую прадукцыйнасць, яна на 81% перавышае стандарт па насеннай прадукцыйнасці.

Тэтраплоідны сорт канюшыны лугавой Шматгадовая дзякуючы павышанай устойлівасці да каранёвых гніляў забяспечвае сабе больш працяглае існаванне. Па асноўных паказчыках кармавой прадукцыйнасці яна пераўзыходзіць стандарт Цудоўны на 11—16%, па насеннай — на 51%.

Істотнай вартасцю вылучаецца і перададзены ў дзяржсортавыпрабаванне новы сорт канюшыны паўзучай Атаўная. Яна прыдатная для пашавага і ўкоснага выкарыстання. Яе прадукцыйнасць у сярэднім за год па сене склала 102 ц/га, па сырому пратэіну — 18,3, па насенні — 3,1 ц/га; адпаведна на 8,2, 6,2 і 16,5% вышэй за стандарт (сорт Волат).

У выніку даследаванняў па ўдасканальванню прыёмаў павышэння ўраджайнасці насення канюшыны выяўлена высокая эфектыўнасць рэглону ў якасці гербіцыду для барацьбы з пустазеллем, асабліва з рамонкам і іншым зімуючым пустазеллем.

Ва ўмовах Беларусі з-за выпадання значнай колькасці ападкаў адбываецца моцнае галінаванне раслін канюшыны, паніжаецца завязвальнасць насення, павялічваюцца страта завязі і працэнт шчуплага насення.

З мэтай максімальнага скарачэння страт гібелі завязі і паніжэння долі шчуплага насення ў перыяд плодаўтварэння неабходна спыніць рост і паменшыць галінаванне раслін. Трохгадовыя даследаванні паказалі, што зрабіць гэта можна з дапамогай хімічнай чаканкі (апрацоўка пасеваў у перыяд масавага цвіцення марфанолам ці сумессю 2,4 ДА+ +ДМСО — фенаксід). Гэты прыём рэзка паніжае ступень галінавання раслін і павышае ўраджайнасць насення прыкладна на 25%.

Вядзенне ўстойлівага насенняводства канюшыны ва ўмовах Беларусі немагчымае без выкарыстання дэфаліяцыі насенных пасеваў. Для гэтага выкарыстоўваецца рэглон. З айчынных прэпаратаў эфектыўны ЭДІЛ, ад выкарыстання якога ў дозе 8 л/га праз пяць дзён пасля апрацоўкі вільготнасць травастою паніжалася з 70—75 да 18—20% і значна памяншаліся страты насення пры ўборцы.

Можна выкарыстоўваць таксама хларат магнію ў дозе 30 кг/га ці аміннуюсоль 2М-4Х у дозе 4 л/га. Аднак эфектыўнасць гэтых прэпаратаў значна ніжэйшая і яны паніжаюць вільготнасць травастою толькі да 23—25%.

У доследах па ўдасканальванню тэхналогіі вырошчвання канюшыны на корм выяўлена, што на супясчаных глебах з няўстойлівым водным рэжымам канюшына гібрыдная саступае канюшыне лугавой на 26—30%. Пры строгім захаванні тэхналогіі ёсць магчымасць норму высявання канюшыны лугавой у травасумесях панізіць з 10 да 6 кг насення на 1 га, ці на 40%. Пры гэтым найбольшы выхад пажыўных рэчываў дасягаецца пры колькасці канюшыны ў травасумесях у межах 70%. Пры памяншэнні яе долі да 30% зніжаецца страўнасць пажыўных рэчываў, памяншаецца выхад кармавых адзінак. Гэтымі даследаваннямі выяўлена, што бабова-злакавае сена I класа з утрыманнем у 1 кг сухога рэчыва 80—100 г страўнага пратэіну можна атрымаць пры наяўнасці ў травастоі канюшыны не менш за 50—70%.

Даследаванні па сіласных культурах праводзіліся ў асноўным з кукурузай, плошча якой у сярэднім за пятую пяцігодку склала 422 тыс. га; пад іншымі сіласнымі культурамі занята 48 тыс. га.

У выніку селекцыйнай работы сумесна з Малдаўскім НДІ кукурузы і сорга ў гэтай пяцігодцы створаны і перададзены ў дзяржсортавыпрабаванне тры гібрыды кукурузы — Бема 181 АСВ, Бема 182 СВ і Бема 160 МВ. У 1988 г. раяніраваны Бема 181 СВ.

Новыя гібрыды Бема 181 АСВ і 182 СВ раўнацэнныя стандарту 181 СВ па ўраджайнасці сухога рэчыва і пераўзыходзяць яго па зерневай прадукцыйнасці. У доследах 1988—1989 гг. ураджайнасць зерня гэтых гібрыдаў дасягала 102 ц/га. Гібрыд Бема 160 МВ як больш хуткаспелы істотна саступае стандарту па зборы сухога рэчыва, але на 6,1 ц/га перавышае яго па ўраджаі зерня (95,5 ц/га).

Даследаваннямі па тэхналогіі вырошчвання кукурузы на зерне выяўлена, што спосабы асенняй зяблевай апрацоўкі супясчаных глеб пасля зерневых культур (узворванне, дыскаванне, чызеляванне) у спалучэнні з веснавым загортваннем гною плугам па ўплыву на ўраджайнасць практычна раўнацэнныя, але асенняе выкарыстанне шыроказахопных прылад (дыскі, чызель) павышае эфектыўнасць тэхналогіі. У тым выпадку, калі кукуруза размяшчаецца пасля кукурузы, знікае неабходнасць праводзіць зяблевую апрацоўку, а дастаткова веснавога дыскавання ці чызелявання ў спалучэнні з перадпасяўной культывацыяй. Магчыма і прамая сяўба ржышчавай сеялкай. У гэтым варыянце ўраджайнасць зерня была найбольшай, а засмечанасць пасеваў і затраты — найменшымі. Выяўлена, што пры ўсіх спосабах апрацоўкі супясчанай глебы больш эфектыўна дробнае ўнясенне азотных угнаенняў у параўнанні з разавым.

Значнае месца ў кармавым балансе займаюць караняплоды. У мінулай пяцігодцы перададзены ў дзяржсортавыпрабаванне новы сорт кармавой морквы Красачка з ураджайнасцю караняплодаў 581,0 ц/га і колькасцю сухога рэчыва 12,7%, а таксама сорт кармавых буракоў Лань з ураджайнасцю 824 ц/га і колькасцю сухога рэчыва 16,5%. Раяніраваны сорт кармавых паўцукровых буракоў Жодзінка з ураджайнасцю 700 ц/га і колькасцю сухога рэчыва каля 17%.

Распрацавана і праверана ў вытворчых умовах тэхналогія механізаванага вырошчвання і ўборкі кармавых буракоў, якая пры затратах працы 0,31 чал/гадз на 1 ц і сабекошце 1,77 руб/ц забяспечвае ўраджайнасць кармавых буракоў 700—800 ц/га. У выніку распрацоўкі тэхналогіі выяўлена:

1. Апошнім тэрмінам сяўбы (ці перасявання) кармавых буракоў для ўмоў цэнтральных раёнаў Беларусі з'яўляецца другая палавіна мая і пачатак чэрвеня (да 5 чэрвеня). Больш познія тэрміны забяспечваюць ураджайнасць ніжэй за 400 ц/га, што эканамічна немэтазгодна.